# ГРАДУС НАПРУЖАННЯ РАСЦЕ



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. )

Між іншым, апошнім часам прапаноў скарыстацца «разумным» гадзіннікам са шпаргалкай, мікранавушнікамі ці нананавушнікамі ў інтэрнэце вельмі шмат. Сучасныя тэхнічныя прыстасаванні можна набыць або ўзяць напракат. Як экзаменатары збіраюцца іх адсочваць?

— Калі ў членаў камісіі ўзнікнуць сумненні, абітурыенту могуць прапанаваць здаць гадзіннік да канца экзамену, — тлумачыць **адказны сакратар Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў Ірына БУЦЬКО.** — У кожнай экзаменацыйнай аўдыторыі на сцяне вісіць вялікі гадзіннік. Гэта агульнае патрабаванне для ўсіх аўдыторый, дзе праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне. Таму ва ўсіх ёсць магчымасць сачыць за часам. А калі абітурыент адмовіцца здаваць гадзіннік, ён акажацца пад вельмі пільнай увагай арганізатараў у аўдыторыі...

## Ад сейфа і да аўдыторыі

А палове адзінаццатай на вачах у журналістаў арганізацыйная камісія разам з прадстаўнікамі Камітэта дзяржкантролю адчыніла сейф, куды ў 7 гадзін раніцы былі змешчаны матэрыялы цэнтралізаванага тэсціравання. Дастаўкай усіх экзаменацыйных матэрыялаў па краіне займаюцца кур'еры фельд'егерскай службы. Матэрыялы ЦТ дастаўляюцца ў апламбаваных сумках накшталт інкасатарскіх. Для дастаўкі тэстаў ва ўсе аўдыторыі, дзе праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне, рыхтуюцца спецыяльныя пакеты з сакрэтнай стужкай, якія проста немагчыма ўскрыць непрыкметна, скажам, на шляху ад сейфа да аўдыторыі. Як толькі цэласнасць стужкі парушаецца, на ёй праступаюць схаваныя ад вачэй сімвалы. Да таго ж на кожным пакеце ёсць ярлычок, дзе нанесены нумар і штрых-код, што дазваляе ідэнтыфікаваць пакеты пры іх вяртанні з пунктаў тэсціравання ў Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў. Бланкі адказаў вырабляюцца на фабрыцы Дзяржзнака, маюць ступені аховы такія, як на грашовых знаках, і з'яўляюцца дакументамі строгай справаздачнасці, таму цалкам выключаецца магчымасць іх фальсіфікацыі.

На кожную аўдыторыю запаўняецца акт, у якім пазначана не толькі колькасць бланкаў, але і іх нумары, таму чужыя бланкі апынуцца ў пакеце не могуць. Да таго ж і арганізатары ЦТ у аўдыторыі пацвярджаюць сваім подпісам, што менавіта гэты бланк знаходзіўся ў экзаменацыйнай аўдыторыі.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дарэчы, падчас ЦТ па беларускай мове па краіне было задзейнічана 369 аўдыторый, а падчас самай масавай дысцыпліны (ЦТ па рускай мове) іх будзе 1234.

## Усё пад кантролем

Да прыёмнай кампаніі прыцягнуты па краіне больш як дзве сотні супрацоўнікаў Камітэта дзяржаўнага кантролю, якія павінны адсочваць усе яе ключавыя моманты: ад правядзення тэставых выпрабаванняў да падачы дакументаў у прыёмныя камісіі і залічэння. Іх «вахта» закончыцца толькі пасля завяршэння залічэння ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.

— У рэгіёнах створана шэсць абласных камісій на чале са старшынямі Камітэта дзяржкантролю абласцей, а таксама 61 кантрольная камісія — ва ўстановах адукацыі, — расказвае **кіраўнік рабочай групы дзяржаўнай камісіі, начальнік галоўнага ўпраўлення Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандр КУРЛЫПА**. — Каардынуе дзейнасць абласных камісій і камісій па кантролі ва ўстановах адукацыі рабочая група дзяржкамісіі са штаб-кватэрай у Мінску, у Камітэце дзяржаўнага кантролю.

Для аператыўнага рэагавання на звароты выпускнікоў і іх бацькоў па пытаннях уступных іспытаў працуе тэлефон «гарачай лініі» рабочай групы ў Мінску (8 017 327 66 80). Але звяртацца ў штаб-кватэру можна і для асабістага прыёму.

У 10.45 пакеты з бланкамі адказаў і тэставымі заданнямі дастаўляюцца ў экзаменацыйныя аўдыторыі. Градус напружання расце. Абітурыентам даюць апошнія кансультацыі: як правільна запаўняць вобласць рэгістрацыі і бланкі адказаў, дзе можна знайсці ваду, калі захочацца папіць, як паводзіць сабе, калі раптам яны адчуюць сабе дрэнна, што рабіць, калі скончыцца папера для чарнавіка. Просяць яшчэ раз праверыць сваё рабочае месца на прадмет прысутнасці там забароненых рэчаў. За пяць хвілін да 11 гадзін у аўдыторыі, разлічанай на 80 чалавек, пяць месцаў яшчэ застаюцца незапоўненымі. Як заўсёды, знаходзяцца абітурыенты, якія паспяваюць ускочыць літаральна ў апошні вагон — за некалькі хвілін да старту экзамену арганізатары прапускаюць у аўдыторыю яшчэ двух чалавек. Журналістам тлумачаць: абітурыенты, якія прыходзяць у пункт правядзення ЦТ пасля ўскрыцця пакета з педагагічнымі тэстамі, у аўдыторыю ўжо не дапускаюцца.

**У канцы дня стала вядома, што на цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай мове не з'явіўся 631 абітурыент, ці крыху менш за 3% ад агульнай колькасці прайшоўшых рэгістрацыю. Усяго прайшлі выпрабаванне 21 717 чалавек. На іспытах не было зарэгістравана ні аднаго выдалення.**

На гадзінніку 11.00. Пакет з бланкамі адказаў ускрываецца. Журналістаў просяць пакінуць аўдыторыю.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*



Фота БЕЛТА.

### Што трэба ведаць удзельнікам ЦТ:

— На тэсціраванні абавязкова трэба мець з сабой арыгінал дакумента, які сведчыць асобу ўдзельніка ЦТ: гэта можа быць пашпарт, пасведчанне на права жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, пасведчанне бежанца ці даведка органаў унутраных спраў, якая выдаецца ў выпадку страты (крадзяжу) дакумента. З ксеракопіяй пашпарта на ЦТ нікога не прапускаюць, як і з вадзіцельскім пасведчаннем.

— У аўдыторыю забараняецца праносіць любыя прадметы, за выключэннем дакумента, які сведчыць асобу, пропуска і гелевай ці капілярнай ручкі з чорным чарнілам. Праносіць з сабой ваду ў экзаменацыйныя аўдыторыі арганізатары не дазваляюць, бо абітурыенты могуць яе разліць і сапсаваць не толькі свае, але і чужыя экзаменацыйныя матэрыялы. Але вада ў аўдыторыях заўсёды ёсць — яе трэба шукаць на асобным століку.

— Пры атрыманні экзаменацыйных матэрыялаў абітурыент абавязаны пераканацца ў адпаведнасці нумара варыянта бланка адказаў нумару варыянта педагагічнага тэста. Абітурыент нясе адказнасць за захаванасць экзаменацыйных матэрыялаў з моманту іх атрымання да моманту перадачы арганізатарам тэсціравання. Выкарыстанне экзаменацыйных матэрыялаў для рабочых запісаў не дапускаецца. Для чарнавых запісаў арганізатары павінны прадастаўляць паперу ў дастатковай колькасці.

— Катэгарычна забараняецца фальсіфікаваць звесткі ў бланку адказаў у зоне рэгістрацыі. Таксама забараняецца перасаджвацца на іншае месца і мяняцца педагагічнымі тэстамі.

— У тым выпадку, калі самаадчуванне абітурыента рэзка пагоршыцца, гэты факт абавязкова павінен засведчыць медыцынскі работнік. З медыцынскай даведкай абітурыенту будзе дадзена магчымасць пераздаць гэту дысцыпліну ў рэзервовы дзень. Але падоўжыць тэрмін выканання тэставай работы арганізатары, якія прысутнічаюць у аўдыторыі, не маюць права.

— Многіх цікавіць, а ці можна ў экстранным выпадку выйсці з экзаменацыйнай аўдыторыі ў прыбіральню? Арганізатары запэўніваюць, што ў гэтым ніхто перашкаджаць не будзе: абітурыент здае сваю экзаменацыйную работу арганізатарам, затым у суправаджэнні супрацоўніка ён можа пакінуць аўдыторыю, вярнуцца і прадоўжыць выпрабаванне. Аднак абітурыент пры гэтым губляе час, які даецца для выканання тэста.

— Пачаткам адліку часу, адведзенага на ЦТ, з'яўляецца час атрымання апошняга экзэмпляра педагагічнага тэста.

— Працэдура апеляцыі на цэнтралізаваным тэсціраванні не прадугледжана, аднак абітурыент мае права ў працэсе тэсціравання заявіць арганізатарам, што нейкае заданне, на яго думку, складзена некарэктна, у ім ёсць памылка ці не прыведзена правільных адказаў. Усе прэтэнзіі заносяцца ў пратакол з указаннем нумара варыянта педагагічнага тэста, нумара задання і зместу заўвагі. Пытанні абітурыентаў наконт зместу педагагічных тэстаў у экзаменацыйнай аўдыторыі не разглядаюцца.

■ Бывай, суворaўскае!

# ПЕРШАЯ СТУПЕНЬ ДА МАРЫ

## 98% выпускнікоў Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча зрабілі выбар на карысць афіцэрскай прафесіі

**Юбілейны — 60-ты — выпуск адбыўся ў Мінскім суворaўскім ваенным вучылішчы. Па традыцыі атэстаты юнакам уручылі выбітныя военачальнікі, у тым ліку міністр абароны. Да ўрачыстага рытуалу далучыўся і міністр адукацыі.**

— Кожны суворавец ведае такую прымаўку: той, хто не паступіў у суворaўскае вучылішча, павінен радавацца, а той, хто паступіў, — ганарыцца, — зазначыў **міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ**. — Дзяржава робіць усё, каб падрыхтоўка ў Мінскім суворaўскім ваенным вучылішчы ажыццяўлялася на самым высокім узроўні. Гэта тычыцца і кваліфікацыі выкладчыкаў, і вучэбна-матэрыяльнай базы. Цяжка прыгадаць той орган дзяржаўнага кіравання, тую дзяржаўную структуру і не толькі дзяржаўную, дзе не знайшлі б сваё прымяненне фізічна падрыхтаваныя, з выдатнай адукацыяй людзі, якія ў свой час заканчвалі суворaўскае ваеннае вучылішча. І не толькі мінскае.

Павіншаваў выпускнікоў і пажадаў з годнасцю несці званне суворaўца і **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ**: «Я прагледзеў вашы атэстаты і скажу, што не кожная гімназія можа пахваліцца такім вынікам. Што б вы ні выбралі — цывільную працу ці службу — зычу вам заставацца патрыётамі, годнымі грамадзянамі нашай краіны».

Сёлета са сцен вучылішча выходзіць 55 чалавек. Практычна 98% выпускнікоў асэнсавана зрабілі выбар на карысць прафесіі афіцэра. 70% выхаванцаў суворaўскага — будучыя прадстаўнікі ўлады ва Узброеных Сілах, астатнія будуць служыць у Камітэце дзяржаўнай бяспекі, Міністэрстве ўнутраных спраў і Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях.

Старшы віцэ-сяржант, намеснік камандзіра ўзвода Максім Сергіевіч лічыць, што суворaўскае вучылішча — першая ступень да яго мары стаць вайскоўцам. Паступае юнак у Ваенны ўніверсітэт Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі на факультэт замежнай ваеннай інфармацыі. Увогуле ўражваюць навучальныя ўстановы, дзе правядуць найбліжэйшыя гады сённяшнія выпускнікі: Ваенна-медыцынская акадэмія імя Кірава ў Санкт-Пецярбургу, Ваенна-касмічная акадэмія імя Мажайскага (Санкт-Пецярбург)...

— Асноўная мэта навучання нашых суворaўцаў заключаецца ў тым, каб на канчатковым этапе падрыхтаваць дзяржаўніка, чалавека, гатовага да самаахвяравання, — перакананы **начальнік Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча генерал-маёр Віктар ЛІСОЎСКІ**. — Мы бачым, што сёння адбываецца ў свеце, назіраем за падзеямі ў тым ліку ў нашых суседзяў. Разбураюцца населеныя пункты, гарады і нават цэлыя цывілізацыі. І мы павінны добра разумець, што ў нашай дзяржавы павінны быць падрыхтаваны сапраўдны рэзерв, які ў першыя хвіліны, калі раптам спатрэбіцца, неадкладна выступіць на абарону сваёй Айчыны і, як бы пафасна гэта ні гучала, аддасць жыццё за сваю Радзіму, за свой народ.

Разам з колішнімі выхаванцамі святочны і трохі хвалюючы настрой падзялілі першыя выпускнікі вучылішча. Для іх, дзяцей вайны, суворaўскае вучылішча стала не толькі навучальнай установай, а і ў прамым сэнсе родным домам. Адзін з першых выпускнікоў вучылішча, **старшыня міжнароднай асацыяцыі «Кадэцкае братэрства» Пётр ЧАВУС** расказвае, што 60 гадоў таму, калі яны стаялі на гэтай жа пляцоўцы, іх было 80 чалавек. «Мы стаялі і думалі, што будзе там, у самастойным жыцці. 92% выпускнікоў выбралі ваенны шлях, — гаворыць генерал-палкоўнік у адстаўцы. — Сёння мы жадаем моладзі, каб яна працягнула нашы добрыя традыцыі».

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*